# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

Минский городской центр недвижимости

**11 мая 2011 г. проводит открытый аукцион № 05-А-11**
**на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).

**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право аренды на 5 лет 6 земельных участков для строительства в г. Минске:

| № п/п | Место расположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | ул. Есенина в районе пересечения с ул. Громова | 500000000005005677 | 0,1809 | объект торговли | 131 356 512 | 13 000 000 | 5 065 903 | – |
| 2 | ул. Громова в районе пересечения с ул. Есенина | 500000000005005678 | 0,0814 | объект общественного питания (кафе) | 59 107 104 | 5 000 000 | 4 900 727 | – |
| 3 | У входа №1 станции метро «Каменная горка» по ул. Притыцкого | 500000000006006045 | 0,0180 | объект общественного питания | 13 970 880 | 1 000 000 | 4 884 791 | – |
| 4 | У входа №2 станции метро «Каменная горка» по ул. Притыцкого | 500000000006006047 | 0,0146 | объект общественного питания | 11 333 952 | 1 000 000 | 4 440 945 | – |
| 5 | ул. Матусевича | 500000000006006046 | 0,4000 | размещение детских аттракционов на земельном участке в парке 60-летия Октября | 336 353 472 | 33 000 000 | 4 786 333 | – |
| 6 | ул. Могилевская | 500000000004004519 | 0,2500 | административно-торговый комплекс | 251 430 480 | 25 000 000 | 4 492 241 | – |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **11.05.2011 в 11[00]** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 04.05.2011)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 08.04.2011 по 04.05.2011 по рабочим дням в рабочее время.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

# ...Не перашкода для размеркавання ў Мінск

*(Працяг. Пачатак на 1-й «ЧЗ»)*

Вельмі добра было б «падмацаваць» сваё размеркаванне некалькімі заяўкамі. Хачу таксама дадаць, што персанальная заяўка — гэта запыт на канкрэтнага чалавека, і іншага выпускніка камісія па размеркаванні не можа адправіць да наймальніка. У персанальнай заяўцы павінна быць дакладна прапісана, на якую пасаду вас бяруць, і калі прапанаваная вам пасада не адпавядае профілю вашай спецыяльнасці, то такую заяўку могуць смела праігнараваць. Праігнараваць персанальную заяўку могуць і ў тым выпадку, калі камісія не ў стане задаволіць усе заяўкі, што паступілі ва ўстанову адукацыі з адпаведных рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання. Трэба разумець, што **размеркаванне** — гэта **працаўладкаванне па спецыяльнасці.** Аднак калі заявак менш, чым выпускнікоў, то выпускніку могуць прапанаваць працаўладкаванне не зусім па яго спецыяльнасці. Мы заўважылі, што апошнім часам размеркавацца не зусім па сваёй спецыяльнасці прасцей, чым затым перараразмеркавацца. І гэта таксама трэба мець на ўвазе. Калі камісія не можа прадаставіць выпускніку працу па спецыяльнасці, то выдае яму даведку аб свабодным працаўладкаванні.Многіх выпускнікоў сталічных ВНУ, якія не жадаюць пакідаць сталіцу, хвалюе пытанне: **ці могуць ім адмовіць у размеркаванні ў Мінск на той падставе, што ў іх няма ў сталіцы пастаяннай рэгістрацыі?**

— Наяўнасць рэгістрацыі ў Мінску не з'яўляецца абавязковай умовай, — тлумачыць Ларыса Манюк. — Камісію па размеркаванні павінна толькі цікавіць, ці гатовы наймальнік прыняць на работу выпускніка без мінскай рэгістрацыі. Зразумела, што пазней, калі малады спецыяліст прыступіць да працы і захоча стаць у чаргу на жыллё ў Мінску, то яму ўсё роўна спатрэбіцца рэгістрацыя. Статус маладога спецыяліста дзейнічае ўсяго два гады. А стаць у Мінску ў чаргу на жыллё без пяцігадовага чакання могуць толькі маладыя спецыялісты, размеркаваныя ў сталіцу. Усім іншым «не карэнным» мінчанам пасля атрымання пастаяннай сталічнай рэгістрацыі даводзіцца пяць гадоў чакаць, перш чым яны змогуць звярнуцца ў аддзел жыллёвай палітыкі з намерам калі-небудзь пабудаваць сабе ў сталіцы жыллё...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне будзе.)*

# Як падлеткам не трапіць у абдымкі «Facebook-дэпрэсіі»?



**Урачам-педыятрам трэба рэгулярна абмяркоўваць з бацькамі ўплыў сацыяльных сетак і ўвогуле інтэрнэта на фізічнае і псіхічнае здароўе дзяцей і падлеткаў. Адпаведныя рэкамендацыі ўтрымліваюцца ў дакладзе Амерыканскай акадэміі педыятрыі.**

Дзіцячыя ўрачы сцвярджаюць, што зносіны ў інтэрнэце сталі адным з галоўных шляхоў сацыялізацыі амерыканскіх падлеткаў. Паводле апошніх даследаванняў, **больш за палову падлеткаў у ЗША штодня заходзяць у любімую сацыяльную сетку, а больш як 22 працэнты робяць гэта 10 і больш разоў на дзень.**

Педыятры папярэджваюць, што актыўнасць дзяцей і падлеткаў у сетцы мае як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Да першых адносіцца набыццё дадатковых тэхнічных навыкаў, а таксама навыкаў зносін. Што тычыцца другіх, то найбольш верагоднай для падлеткаў небяспекай ад знаходжання ў інтэрнэце з'яўляецца цкаванне ў сетцы, доступ да небяспечнага і не прызначанага для падлеткаў кантэнту, абмен паведамленнямі сэксуальнага зместу, недабраякасная інтэрнэт-рэклама і гэтак далей. У якасці аднаго з прыкладаў у дакладзе прыводзіцца так званая «Facebook-дэпрэсія» — павышаная верагоднасць з'яўлення сімптомаў дэпрэсіўнага расстройства ў падлеткаў, якія занадта шмат часу праводзяць у сацыяльных сетках. Па меркаванні аўтараў даклада, амерыканскія педыятры павінны павышаць узровень інфармаванасці бацькоў аб патэнцыяльных праблемах у іх дзяцей, непасрэдна звязаных з інтэрнэтам. Амерыканскім педыятрам рэкамендуецца прапаноўваць бацькам вывучаць прынцыпы работы сацыяльных сетак, штодня цікавіцца актыўнасцю іх дзіцяці ў інтэрнэце, дапамагаць яму ў планаванні праведзенага ў сетцы часу і, па магчымасці, самім спрабаваць падтрымліваць кантакт з дзіцём праз інтэрнэт.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

В связи с реорганизацией открытого акционерного общества «Минский подшипниковый завод» путем присоединения к нему открытого акционерного общества «НИИ Подшипник», ОАО «МПЗ» уведомляет своих акционеров, имеющих право выкупа акций, о выкупе акций. Цена выкупа 1 акции – 15 рублей. Конечный срок предъявления требований о выкупе акций – 25 апреля 2011 года.

Требования направлять по адресу: **220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 2.**

**Справки по тел. 295 10 33.**

*УНП 100151342*

# Конкурс студэнцкіх навуковых работ — першы крок у вялікую навуку

## Аргкамітэт Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ абвясціў пераможцаў за 2010 год

**Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі, усяго на конкурс было заяўлена 4068 работ, а рэальна ўдзельнічалі ў ім 4045 работ. Сярод аўтараў навуковых работ былі прадстаўлены студэнты абсалютна ўсіх курсаў — ад першакурснікаў (18 чалавек) да магістрантаў. Прыкладна трэцяя частка канкурсантаў (34 працэнты) з'яўляюцца выпускнікамі ВНУ.**

У рамках конкурсу працавала 31 конкурсная камісія ў 24-х ВНУ. Максімальная колькасць работ (343) была заяўлена ў камісію «Эканамічная тэорыя. Макраэканоміка. Фінансы, крэдыт і статыстыка. Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт. Міжнародныя адносіны. Сусветная эканоміка. Міжнароднае права», якую ўзначальваў доктар эканамічных навук, прафесар Міхаіл Кавалёў. У камісію «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве. Інавацыйны менеджмент» было заяўлена 339 работ, а ў камісію «Юрыспрудэнцыя. Паліталогія. Дзяржаўнае кіраванне» — 295 работ.

Па выніках работы конкурсных камісій былі вызначаны 59 лаўрэатаў. Першую катэгорыю атрымалі 742 работы (18,3 працэнта ад агульнай колькасці), другую — 1035 работ (25,6 працэнта), трэцюю — 1004 работы (24,8 працэнта). На пасяджэнні аргкамітэта, якое адбылося 24 сакавіка ў Міністэрстве адукацыі, шляхам галасавання былі вызначаны яшчэ 11 чалавек, якія атрымалі званне лаўрэата за навуковыя вынікі, якія маюць важнае прыкладное значэнне.

У Міністэрстве адукацыі з задавальненнем адзначаюць, што цікаўнасць да конкурсу з боку студэнтаў з кожным годам павялічваецца. Так, за пяць апошніх гадоў колькасць заяўленых на конкурс работ вырасла прыкладна на 1150, а колькасць канкурсантаў — на 1300 чалавек. Калі гаварыць аб перспектыўнасці студэнцкіх навуковых распрацовак, то больш як 90 конкурсных работ ужо апублікаваныя, агучваліся на канферэнцыях, знайшлі ўкараненне ў вучэбным працэсе і ў вытворчасці. У значнай ступені якасць конкурсных работ студэнтаў вызначаецца прафесіяналізмам іх навуковых кіраўнікоў. Між іншым, сярод навуковых кіраўнікоў конкурсных работ былі 345 дактароў і 1817 кандыдатаў навук. Як падкрэслілі ў галоўным адукацыйным ведамстве, за апошнія чатыры гады колькасць кіраўнікоў — кандыдатаў навук — расла апераджальнымі тэмпамі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Годовая отчетность
**Открытого акционерного общества**

# «МОТОВЕЛО»

220033, г. Минск, проспект Партизанский, 8
по состоянию на 01 января 2011 года
и.о. генерального директора - Мороз К.И.
гл. бухгалтер - Рудая А.Э.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

| Актив | Код стр. | На начало года | На конец отчетного года |
|---|---|---|---|
| **1. Внеоборотные активы** | | | |
| Основные средства | 101 | 66 001 | 74 569 |
| Нематериальные активы | 111 | 47 | 21 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 3 043 | 3 505 |
| Прочие оборотные активы | | | 3 539 |
| **ИТОГО по разделу 1** | **190** | **69 091** | **81 634** |
| **2. Оборотные активы** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 23 752 | 14 638 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 214 | 72 |
| Дебиторская задолженность | 240 | 21 552 | 26 182 |
| Денежные средства | 260 | 18 | 295 |
| Финансовые вложения | 270 | 55 430 | 59 819 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 617 | 617 |
| **ИТОГО по разделу 2** | **290** | **101 583** | **101 623** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **170 674** | **183 257** |
| **Пассив** | | | |
| **3. Капитал и резервы** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 107 586 | 109 441 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | 13 | 13 |
| Резервный фонд | 420 | 18 | 59 |
| Добавочный фонд | 430 | 3 276 | 13 181 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 1 703 | 2 142 |
| **ИТОГО по разделу 3** | **490** | **112 596** | **124 836** |
| **4. Долгосрочные обязательства** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 939 | 10 462 |
| **ИТОГО по разделу 4** | **590** | **1 939** | **10 462** |
| **5. Краткосрочные обязательства** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 5 914 | 4 608 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 50 226 | 43 351 |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | -1 | 0 |
| **ИТОГО по разделу 5** | **690** | **56 139** | **47 959** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **170 674** | **183 257** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **1. Доходы и расходы по видам деятельности** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 42 218 | 49 524 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 5 207 | 7 151 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 37 011 | 42 373 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 38 718 | 58 700 |
| Валовая прибыль | 040 | -1 707 | -16 327 |
| Расходы на реализацию | 060 | 2 705 | 1 564 |
| **Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **070** | **-4 412** | **-17 891** |
| **2. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | **120** | **2 836** | **42 824** |
| **3. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | **160** | **-2 192** | **-3 584** |
| **Прибыль (убыток) (070+120+160)** | **200** | **-3 768** | **21 349** |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **300** | **-4 714** | **20 333** |

## ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателя | ед.изм. | За 2010 | за 2009 |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | млн. руб. | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 2,7 | 2,5 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | млн. руб. | - | - |

Количество акционеров -– всего 3 371, в том числе юридических лиц – 4, физических лиц – 3 367

Среднесписочная численность работающих – 645 человек

Основной вид деятельности - производство велосипедов и мотоциклов

*УНН 190017558*

# Минский районный исполнительный комитет *21 апреля 2011 г.* повторно проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Новое Поле | Крупицкий с/с, д. Дубинки | Крупицкий с/с, д. Дубинки | Крупицкий с/с, д. Каралино |
| 2 | Кадастровый номер | 623681315101000213 | 623681315101000218 | 623683903101000051 | 623683903101000052 | 623683905601000146 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1515 га | 0,1521 га | 0,1613 га | 0,1687 га | 0,1535 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 178 283 | 1 178 283 | 660 566 | 736 906 | 719 951 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 11 000 000 | 11 000 000 | 12 000 000 | 12 000 000 | 9 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 100 000 | 1 100 000 | 1 200 000 | 1 200 000 | 900 000 |

| | | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Луговослободской с/с, д. Дворец | Луговослободской с/с, д. Заречье | Луговослободской с/с, д. Заямочное | Луговослободской с/с, д. Ксаверово | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, ул. Зеленая |
| 2 | Кадастровый номер | 623684103101000078 | 623684105601000165 | 623684106601000193 | 623684107601000087 | 623655000001000603 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1554 га | 0,1158 га | 0,1261 га | 0,2302 га | 0,1500 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 062 465 | 1 041 385 | 830 860 | 620 311 | 1 052 290 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 18 000 000 | 11 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 | 63 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 800 000 | 1 100 000 | 2 200 000 | 2 200 000 | 6 300 000 |

| | | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Михановичский с/с, п. Михановичи | Новодворский с/с, а/г Гатово, участок № 62 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 36 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 415 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 453 |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204601001287 | 623684301601000357 | 623687508101001111 | 623687508101001086 | 623687508101000731 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1397 га | 0,1532 га | 0,1397 га | 0,1320 га | 0,1488 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 600 670 | 506 546 | 331 886 | 331 886 | 331 886 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 37 000 000 | 24 000 000 | 14 000 000 | 15 000 000 | 17 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 700 000 | 2 400 000 | 1 400 000 | 1 500 000 | 1 700 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 21.04.2011 г. в 9.15. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 15.04.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3–5 перечисляется на расчетный счет № 3600621050071 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 6–9 перечисляется на расчетный счет № 3600621070093 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На Лот 10 перечисляется на расчетный счет № 3600621080100 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лот 11 перечисляется на расчетный счет № 3600621090116 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лот 12 перечисляется на расчетный счет № 3600621100123 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600230217, код платежа – 04901.

На Лоты 13–15 перечисляется на расчетный счет № 3600621170195 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантакты тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.

# РЭП У ВЫШЫВАНКАХ І НАРОДНЫ БРЭЙК-ДАНС

**Беларускамоўныя шоу-праграмы прэзентавалі ўдзельнікі семінара-практыкума вядучых дыскатэчных праграм, які прайшоў у Вяззеўскім сельскім доме культуры Асіповіцкага раёна.**

Магілёўская вобласць робіць стаўку на беларускамоўны фармат. У семінары бралі ўдзел прадстаўнікі з 5 сельскіх раёнаў, якія раней атрымалі хатняе заданне — падрыхтаваць праграмы на роднай мове і з нацыянальнымі адметнасцямі. Вядучыя дыскатэк з Быхаўскага і Бабруйскага раёнаў праводзяць вясёлыя конкурсы народных прыпевак і танцаў. Жаночы гурт з Вяззя прапанаваў народныя песні, выкананыя ў эстраднай манеры. Клічаўцы чытаюць беларускамоўны рэп у вышыванках, спалучаюць у падтанцоўках брэйк-данс і народную харэаграфію.

**Ілона ІВАНОВА.**

Краіна здароўя
Выпуск № 17 (253)

## ВЯЛІКАЯ ВАДА СПЫНІЛАСЯ

Толькі ў Мазыры і Мазырскім раёне Прыпяць ледзь-ледзь нагадвае аб веснавой паводцы. Узровень вады тут падняўся да 462 см (+2 см), але да небяспечнага гэта далёка. Ля Чэрнічаў у Жыткавіцкім раёне вада паступова, па 1 см, пачала адступаць. У Петрыкаве і Петрыкаўскім раёне вада спынілася і застаецца пакуль на ўзроўні 810 см. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, увогуле па Гомельскай вобласці застаюцца падтопленымі 17 населеных пунктаў, 5 жылых дамоў, 4 дачы, 92 падворкі, 6 участкаў дарог. Агульная плошча падтаплення застаецца ранейшай — 2,4 га. Вялікія рэкі практычна вызваліліся ад лёду.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## МАКСІМ + НАСТАССЯ?

**За тры месяцы гэтага года ў загсе Заводскага раёна зарэгістравалі нараджэнне 686 немаўлят: 350 хлопчыкаў і 336 дзяўчынак.**

Цяпер самыя папулярныя імёны для новanароджаных — Максім, Іван, Уладзіслаў, Настасся, Ксенія, Ганна. Сярод рэдкіх імён, якімі назвалі дзяцей жыхары раёна, — Леў, Сільвестр, Радзівон, Фларына, Элеанора, Мар'яна.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,**
*«Мінск—Навіны».*

## МАЦЯРЫНСКІЯ РАЗМОВЫ



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Прамая лінія

# ХВАРЭЕ СТРАЎНІК — РЭАГУЕ СКУРА

**Алергія можа праяўляцца рынітам, кан'юнктывітам, прыступам удушша або крапіўніцай. Не сакрэт, што досыць распаўсюджанае сярод сучаснікаў захворванне заяўляе аб сабе пры непасрэдным кантакце з алергенам. Гэта азначае, што алергічная рэакцыя знікае, як толькі мы выдаляем алерген з нашага жыцця. Калі гэта не ўяўляецца магчымым, прызначаецца спецыфічнае лячэнне. Такім чынам, трэба мець на ўвазе, што алергія не можа непакоіць круглыя суткі і цэлы год. Што харчовая алергія ўласцівая дзіцячаму і маладому ўзросту, а значыць, шанцы абзавесціся ёю ў сталым узросце фактычна роўныя нулю.**

**Пры з'яўленні падазроных сімптомаў, якія сам чалавек схільны аднесці да «алергіі», неабходна спачатку накіравацца на прыём да тэрапеўта, абследаваць страўнікава-кішачны тракт, здаць біяхімічны аналіз крыві. Даўно заўважана, што праблемы са скурай (якія не паддаюцца лячэнню) указваюць на непаладкі са страўнікава-кішачным трактам. Таму ёсць сэнс прайсці як мінімум фібрагастраскапію або ўльтрагукавое даследаванне органаў брушной поласці. А пры выяўленні падчас гэтых даследаванняў нейкіх змен могуць прызначацца і некаторыя іншыя віды абследавання — напрыклад, каланаскапія. Тая ж крапіўніца рэдка бывае алергічнага паходжання, часцей яна можа быць звязана з іншымі хваробамі, у першую чаргу страўніка — ад гастрыту да анкалогіі. Часам віной упартай крапіўніцы з'яўляецца захворванне шчытападобнай залозы. Пры рыніце варта абследавацца ва ўрача-атарыналарынголага.**

**Сёння ў большасці выпадкаў ёсць магчымасць вызначыцца з прычынай алергіі. Дыягнастуюцца бытавая, эпідэрмальная, пылковая, харчовая, грыбковая віды алергіі — па скураных пробах або па крыві, калі вылучаюць спецыфічныя антыцелы імунаглабуліны Е. Такія даследаванні даступныя амаль ва ўсіх абласных бальніцах. Калі пробы аказаліся адмоўнымі, то цалкам магчыма, што праблема носіць не алергічны, а дэрматалагічны характар.**

**А на вашы пытанні адказала дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Людміла МАСЛАВА.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***☎— Капыльскі раён, Вера Іосіфаўна. Год таму на скуры з'явіліся невялікія плямы, а цяпер яны павялічыліся і надта свярбяць. Дэрматолаг даў спачатку нейкі прэпарат, потым прызначыў уколы, але нічога не дапамагло. Паехала ў Мінск, мне зрабілі аналіз, сказалі, што мае быць грыбок. Прапісалі мазь тэрбізіл. Быццам бы плямы прайшлі, аднак, як толькі пачалася летняя спёка, абедзве нагі пачырванелі. Я падумала, што гэта алергія на спёку. Што рабіць, каб такое не паўтарылася сёлетнім летам?***

— Тое, пра што вы расказваеце, не мае ніякага дачынення да алергіі. Вам неабходна зноў звяртацца да дэрматолага. Тым больш, што ўрач-дэрматолаг ужо паставіў вам дыягназ і ўказаў на наяўнасць грыбковай інфекцыі, якая, сапраўды, можа абвастрацца ў цёплы час года. Звычайна для лячэння грыбковай інфекцыі недастаткова адной толькі мазі.

***☎— Гарадок, Ніна. На твары — пачырваненні з пухірамі, твар апухае. У Віцебску паставілі дыягназ — абмежаваны дэрматыт твару. Параілі правесці санацыю лор-органаў, абследавацца ў гастраэнтэролага. На 10 дзён мне прызначалі піць фітамакс, калоць тыясульфат і мазаць скуру адвантанам. Вытрымлівала гіпаалергенную дыету, але не прайшло і трох дзён пасля спынення лячэння, як праблема з'явілася зноў...***

— Тое, пра што вы кажаце, сапраўды не падобна на алергічную прыроду. Алергічны дэрматыт мае месца тады, калі быў кантакт з нейкім алергенам. Скажам, вы нанеслі нейкі касметычны сродак, і на тым месцы, дзе была касметыка, узнікла рэакцыя падобнага кшталту. Як толькі вы адмовіліся ад выкарыстання гэтага сродку, алергія знікла. Харчовая алергія не працякае так, каб праяўляцца выключна на твары. Яна павінна быць больш распаўсюджанай... Таму тое лячэнне, што вам рэкамендавалі, яно, я мяркую, правільнае, але антыгістамінныя прэпараты неабходна прымаць больш працяглы час. Вам трэба назірацца ў дэрматолага. А таксама мець на ўвазе, што любы дэрматыт падтрымліваюць праблемы з боку страўнікава-кішачнага тракту, нейкі ачаг хранічнай інфекцыі.

***— Зараз я прымаю кетаціфен...***

— Кетаціфен дзейнічае не хутка, да таго ж мае седатыўны эфект, таму лепш прымаць прэпараты новага пакалення — напрыклад, парлазін нэа.

***— У кастрычніку я была ў дэрматолага, ён рэкамендаваў парлазін. А кетаціфен мне прызначылі толькі на 30 дзён. Ці можна мне яшчэ што-небудзь папіць, акрамя яго?***

— Навошта вам спалучаць два прэпараты? Можаце працягваць прыём новага сродку без пабочнага эфекту — парлазіну або нэапарлазіну. І надалей вам неабходна падтрымліваць сувязь выключна з дэрматолагам.

***☎— Калінкавічы, Валянціна Рыгораўна. Больш за дзесяць гадоў мы трымалі на дачным участку пчол, аднак у 2009 годзе, у моцную спёку, у суседа пагоршыўся стан, яму выклікалі «хуткую». Медыкі сказалі, што мае быць анафелактоідная рэакцыя. Але ж усё гэта са слоў самых суседзяў... Вось ужо 1,5 года мы просім іх прадаставіць даведку аб сапраўднай прычыне таго дрэннага самаадчування. Бо, можа, суседу стала дрэнна з-за сэрца, а мы ж вывезлі з участка пчол... Як выглядае анафелактоідная рэакцыя? Дзе можна паставіць пробы на пчаліны яд? Ці можа наогул быць алергічная рэакцыя на ўкус пчалы ў чалавека, які ўжывае мёд?***

— У прынцыпе, рэакцыя на ўкус пчалы ў чалавека, які ўжывае мёд, цалкам можа быць. Анафелактоідная рэакцыя можа праяўляцца бронхаспазмам. Часцей за ўсё, інсектная — на ўкусы вос і пчол — алергія праяўляецца або ацёкам твару, або небяспечным для жыцця анафілактычным шокам. На сёння пробы на інсектную алергію зарэгістраваныя ў нашай краіне, але не ў любы момант іх можна правесці, паколькі гэта вельмі дарагія рэагенты і яны не заўсёды ёсць у наяўнасці. Аднак мы маем у распараджэнні наборы для выяўлення спецыфічных антыцелаў у крыві. Калі ваш сусед пагодзіцца на правядзенне такіх проб, я магу гэта арганізаваць. Пазваніце, калі ласка, у рэдакцыю па нумары 287 18 29, каб абмеркаваць, калі ваш сусед зможа пад'ехаць на даследаванне.

***☎— Жодзіна, Іна Міхайлаўна. У дзяцінстве я пакутавала ад дыятэзу, пазней — ад нейрадэрміту. Пасля пераходнага ўзросту ўсё гэта прайшло, але цяпер новая праблема — месяц як свярбіць усё цела. Дэрматолаг прызначыла здачу аналізаў на цукар, біяхімію. Аналізы аказаліся добрымі. Мне выпісалі супрасцін, яшчэ нейкі парашок, але нічога не дапамагае. Што рабіць?***

— Вам трэба паказацца алерголагу Мінскай абласной бальніцы. А да таго прайсці па месцы жыхарства абследаванне страўнікава-кішачнага тракту, можа быць, варта паўтарыць біяхімічны аналіз крыві. Калі б у вас была нейкая харчовая алергія, вы б і самі вылічылі прадукт, які выклікае падобны стан. Але гэта не падобна на харчовую алергію. Думаю, тэрапеўт можа накіраваць вас да абласнога алерголага.

**Святлана БАРЫСЕНКА,**
**Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***

Ён + Яна

# Мужчыны, ад якіх трэба ўцякаць

**Мы, жанчыны, заўсёды спадзяёмся, што нам удасца зрабіць з любога мужчыны ідэал і ўпарта праводзім індывідуальныя майстар-класы па карыстанні нажом і відэльцам або наладжваем прагляды шэдэўраў сусветнага кінематографа. Але ў асобных выпадках думка пра перавыхоўванне не павінна нават з'яўляцца ў вашай галаве, таму што ад некаторых мужчын лепш уцякаць адразу і хутка. Хто яны і як іх распазнаць?**

## Мужчына-алкаголік

***Як яго пазнаць?*** Калі вам здаецца, што мужчына занадта шмат п'е, верагодна, так і ёсць. Калі за адным келіхам віна падчас вячэры ідзе другі, трэці, чацвёрты, калі ніякія сяброўскія вячоркі не ўяўляюцца без бутэлькі — гэта сігнал насцярожыцца. Калі мужчына не можа кантраляваць дозу алкаголю — ёсць падстава сур'ёзна задумацца. Ну а калі мужчына рэгулярна з'яўляецца ў п'яным выглядзе або, тым больш, «адыходзіць» у запой — гэта знак, што пара ад яго ўцякаць.

***Ні ў якім разе*** не спрабуйце яго адвучваць — марна. Вы пройдзеце некалькі стадый: спачатку будзеце лічыць яго куфлі, потым купляць дадому алкаголь, потым зробіце спробу закадзіраваць, але ўсё будзе заканчвацца аднолькава. Зрывамі. У канчатковым выніку вы пераканаецеся, што дарэмна марнавалі час, і пойдзеце ад яго. Можа, зэканоміць гэты час з самага пачатку?

## Мужчына — маральны садыст

***Як яго пазнаць?*** Хутчэй за ўсё, апазнаць у мужчыну гэты тып адразу не атрымаецца. Звычайна мінае нейкі час, і вось вы ўжо зусім да яго прызвычаіліся, і тут ён і прадэманструе вам усе «прывабнасці» свайго характару. Яны могуць праяўляцца па-рознаму: ён можа абражаць вас, зневажаць, скандаліць з вашымі сябрамі, пастаянна паказваць на вашы заганы, а потым прыходзіць суцяшаць, дарыць падарункі і прызнавацца ў каханні. Насцярожцеся, калі на пачатковым этапе вашых стасункаў усё занадта добра. І тым больш задумайцеся, калі на гэтым этапе ўсё ўжо дрэнна — далей наўрад ці будзе лепш.

***Ні ў якім разе*** не паддавайцеся на правакацыі. Такі тып усімі сіламі імкнецца выклікаць у вас бурныя эмоцыі. Памятайце: правакацыя не адбылася, пакуль вы не адрэагавалі. Таму не звяртайце ўвагі на выбрыкі ў ваш адрас і задумайцеся аб тым, як выдаліць свой нумар з яго тэлефоннай кніжкі.

## Мужчына-агрэсар

***Як яго пазнаць?*** Вельмі проста. Калі мужчына падняў на вас руку — гэта не выпадковасць, не «няшчасны выпадак», ён зрабіў гэта не ў запале сваркі. Гэта выхаванне, стаўленне да жыцця і псіхічны стан чалавека. І гэта паўторыцца зноў.

***Ні ў якім разе*** не праяўляйце зваротную агрэсію ў яго адрас, асабліва падчас сварак (калі вы, вядома, не ўладальніца чорнага пояса па каратэ).

## Мужчына-альфонс

***Як яго пазнаць?*** Можа, яго «прывабіла» ваша кватэра, а можа, перспектыва з вашай дапамогай уладкавацца на добрую працу — так ці інакш, ён шукае ад вашых стасункаў выгады для сябе. Хутчэй за ўсё, ён наладзіць цудоўнае заляцанне, рамантычныя прагулкі, букеты, град sms і гарачы сэкс. І вось вы не можаце без яго жыць, а ён аддана глядзіць вам у вочы, прыкідваючы, якую выгаду ён атрымае ад гэтага саюза. Аказваецца, у яго вялікія праблемы: хворая мама, няма працы, нявыплачаны крэдыт (патрэбнае падкрэсліць), і вы проста абавязаны яму дапамагчы.

***Ні ў якім разе*** не дазваляйце яму «сесці» вам на шыю. Не аплачвайце рахункі, не пазычайце грошай і не згаджайцеся на яго пераезд да вас праз тыдзень пасля знаёмства, якім бы чароўным ён ні здаваўся. Сыходзіць ад такога мужчыны варта вельмі хутка і з гонарам, каб не было адчування, што вамі проста скарысталіся.

## Мужчына — паталагічны распуснік

***Як яго пазнаць?*** Распуснік, ён жа бабнік, спакусіць вас прыгожа. Вельмі прыгожа і вельмі хутка, вы проста не зможаце ўстаяць перад яго напорам. Яшчэ б, у яго ж вялізны досвед заваёўвання жанчын, але досвед стасункаў пры гэтым — нулявы. Яго мэта — займець вас любой цаной, а пасля гэтага адправіцца заваёўваць іншую «вяршыню». Чаму ён так сябе паводзіць? Можа, павышае самаацэнку, можа, баіцца страціць сваю свабоду — хутчэй за ўсё, і першае і другое, а значыць, да нармальных адносін ён проста не дарос, і не факт, што калі-небудзь гэта зменіцца.

***Ні ў якім разе*** не ўлюбляйцеся ў яго, таму што расчараванне вам не пазбегнуць. Не фліртуйце з ім і не пападайцеся на яго вуду. З такімі мужчынамі лепш за ўсё проста сябраваць — калі, безумоўна, вы верыце ў магчымасць сяброўства паміж мужчынам і жанчынай.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Прафілактыка

# ЗАРАДЗІ СЭРЦА

**КАЛІ тлушчавыя адкладанні і задышка нарэшце перасталі ўпісвацца ў вобраз «ідэальнага Я», самы час пачаць павялічваць фізічную нагрузку. Галоўнае ў гэтым пытанні — не перабраць.**

Многія пачынаюць новае жыццё з панядзелка, купляюць абанементы ў трэнажорную залу і басейн. І ўжо праз два-тры дні гэтага самага новага жыцця жменямі глытаюць абязбольвальныя і з цяжкасцю перасоўваюць ногі. Са старой «добрай» гіпадынаміяй і лянотай хаця б мышцы так не нылі. Ды і сэрцайка неяк дзіўна сябе паводзіць. Чаму? Таму што забыліся або не ведалі, што ад гіпадынаміі сэрца пакутуе ў першую чаргу. І вяртанне да актыўнага жыцця трэба пачынаць з трэніроўкі гэтай самай важнай мышцы ў арганізме.

## ЗАРАДКА ДЛЯ СЭРЦА

Для сэрца прыдуманы спецыяльны тып трэніровак — кардыятрэніроўкі (яны ж аэробныя). Гэта простыя і дастаткова працяглыя нагрузкі, даступныя кожнаму. Яны дазваляюць паступова ўмацаваць сардэчную мышцу, павялічыць аб'ём крыві, які яна (мышца) выштурхвае ў сасуды. У тым ліку і тыя, якія сілкуюць само сэрца.

Кардыятрэніроўкі дапамогуць павялічыць аб'ём лёгкіх, павысіць вынослівасць і нават справіцца са стрэсам. Дарэчы, тлушч яны таксама спальваюць. І калі арганізм, нарэшце, выйдзе ў здаровы працоўны рэжым, можна ўзяць з паліцы запылены абанемент і ісці «кідаць жалеза».

## ШТО МОЖА СЭРЦА

Асноўная прыкмета здаровага трэніраванага сэрца — уменне эканоміць сілы, замаруджваючы пульс у стане спакою і паскараючы яго пры нагрузках. Калі пульс у спакоі складае каля 60 удараў у хвіліну, значыць, сэрца працуе нармальна. Але калі частата ўдараў складае больш чым 80, значыць, у сардэчна-сасудзістай сістэмы пачаліся сур'ёзныя праблемы.

Гэта не адмяняе неабходнасці трэніроўкі, але папярэджвае пра асцярожнасць.

## З ЧАГО ПАЧЫНАЦЬ ТРЭНІРОЎКУ

З невялікага ўрока матэматыкі. Ён дапаможа вызначыць, з якой інтэнсіўнасцю можна будзе трэніравацца. Спачатку трэба палічыць максімальную частату сардэчных скарачэнняў (МЧСС), індывідуальную для кожнага ўзросту.

МЧСС = 220 мінус узрост.

Зараз можна разлічваць нагрузку. Аптымальнай лічыцца інтэнсіўнасць выканання практыкаванняў, пры якой частата сардэчных скарачэнняў складае 75—85 працэнтаў ад МЧСС. Дапушчальны мінімум — 65 працэнтаў. А вось нагрузка, пры якой пульс пачашчаецца менш, чым на 60 працэнтаў ад МЧСС, практычна бескарысная.

## АД РАЗЛІКАЎ — ДА ПРАКТЫКІ

Запаветны лік атрыманы, але як ужыць яго на практыцы? Па-першае, выбраць той від спорту, які сапраўды падабаецца. Калі хочацца выкарыстаць абанемент у трэнажорную залу, то можна займацца на бегавой дарожцы, стэперы (імітуе хаду па прыступках) або велатрэнажоры.

Калі падабаецца свежае паветра, то выдатна падыдзе язда на веласіпедзе, бег, хада, лыжы.

Можна займацца і дома, калі там ёсць дзе паставіць трэнажор або суседзі не супраць рытмічнай музыкі для танцаў.

## РАЗ, ДВА, ПАЧАЛІ!

Любы занятак трэба пачынаць з размінкі. Бо арганізму таксама трэба прачнуцца і сагрэцца. А потым ужо прыступаць да выбранага практыкавання. Паступова арганізм увойдзе ў «рабочую зону», у якой частата сардэчных скарачэнняў павінна дайсці да ўзроўню палічанай інтэнсіўнасці. І застацца ў ім на працягу ўсяго занятку.

Пры гэтым не трэба імкнуцца адразу набраць максімальную хуткасць, накручваючы педалі. Хутчэй за ўсё, утрымаць пульс «у рамках» не атрымаецца. Дасведчаныя трэнеры адзначаюць: пры выкананні кардыяпрактыкаванняў чалавек павінен быць у стане спакойна размаўляць.

Тым, хто толькі пачаў займацца, хопіць некалькіх хвілін, але паступова працягласць трэніроўкі можна давесці да паўгадзіны, а потым і гадзіны. Толькі не варта забываць правяраць паказчыкі пульсу — ці не «пайшлі» яны вышэй або ніжэй за вызначаны парог. У такім разе інтэнсіўнасць руху трэба панізіць або павысіць. І не забыць пра тое, што размінку трэба паўтарыць у канцы занятку — каб арганізм астыў, а сэрца плаўна вярнулася да нармальнага рэжыму скарачэнняў.

Галоўнае ў кардыятрэніроўцы (зрэшты, як і амаль у любой іншай) — усё трэба рабіць плаўна, без рэзкага павелічэння або паніжэння нагрузкі.

## І КОЛЬКІ?

Тым, хто толькі пачаў заняткі, спецыялісты рэкамендуюць тры трэніроўкі на тыдзень; больш падрыхтаваныя могуць займацца і часцей. Ды і потым, калі спортам захочацца заняцца сур'ёзна, пра важнасць трэніровак сэрца і сасудаў забываць не варта.

А калі часу на тры разы ў тыдзень не хапае? У штодзённым жыцці ёсць велізарная колькасць практыкаванняў для кардыятрэніроўкі. Прайсціся пешшу ад метро да дома — у адным рытме, дыхаючы размерана. Падняцца па лесвіцы на некалькі паверхаў — не бягом, але рытмічна перастаўляючы ногі. Танцаваць дома, выціраючы пыл або падмятаючы падлогу. Хадзіць у краму пешшу і з заплечнікам. Ды ці мала яшчэ спосабаў патрэніраваць сваю самую важную мышцу!

### ТАКІМ ЧЫНАМ, КАРДЫЯ!

- **Хада ў хуткім тэмпе — пачатковы этап трэніровак. Гэта самая простая аэробная або кардыянагрузка, важна толькі сачыць за пульсам: калі ён роўны пульсу спакою, спартыўнай нагрузкі вы не атрымліваеце, а проста гуляеце.**
- **Плаванне — другі па ступені «добразычлівасці» від кардыянагрузак. Правіла тое ж самае — не купайцеся, а плавайце.**
- **Бег трушком або мігатлівы бег (бег—крок). Урачы лічаць, што кожны здаровы чалавек павінен быць у стане прабегчы, не спыняючыся, два кіламетры. Бег трушком хутчэй за ўсё прыводзіць сэрца і дыханне ў парадак, але для заняткаў бегам патрабуецца шэраг падчас цяжкавыканальных умоў: зручная дарожка, сіла волі, час на прабежку і душ пасля яе, адсутнасць перашкод у выглядзе сабак і да т.п.**
- **Язда на веласіпедзе часцей за ўсё носіць прыкладное дачнае значэнне, хоць гэта выдатны від нагрузкі, вельмі карысны жанчынам, — ногі становяцца прыгожай формы, «падбіраюцца» сцёгны.**
- **Лыжы, канькі — нямногія энтузіясты зімой праводзяць трэніроўкі хаця б праз дзень. Хоць, калі ездзіць увесь сезон кожныя выхадныя, дапаўняючы гімнастыкай і якой-небудзь сістэмнай нагрузкай, — атрымаецца нядрэнна.**
- **Скачкі са скакалкай — вельмі актыўная нагрузка. Скакаць 20 хвілін цяжка, але вынік таго варты! Праўда, гэта ўжо занятак для дастаткова трэніраванага чалавека.**

Далікатнае

# ГЕМАРОЙ: САРАМЛІВАСЦЬ І СТРАХ — ПРЭЧ!

**ПРЫ гэтым слове многія сарамліва апускаюць вочы. Расказаць пра сапраўдную крыніцу сваіх пакут тыя, хто хварэе на гемарой, не рашаюцца нават доктару. І часта дацягваюць да такога стану, што ўжо не могуць ні сядзець, ні хадзіць, трапляючы з назіральнага кабінета наўпрост на аперацыйны стол.**

Гемарой — гэта варыкознае расшырэнне кавернозных вен прамой кішкі, размешчаных вакол або ўнутры анальнай адтуліны. Адрозніваюць гемарой вонкавы, калі расшыраныя гемараідальныя вузлы (мехападобныя, перапоўненыя крывёю сасуды) і вены выходзяць вонкі, і гемарой унутраны, калі пакутуюць унутраныя вены, а вузлы знаходзяцца ў прамой кішцы.

## ЧАМУ ЁН УЗНІКАЕ?

Зарабіць гемарой прасцей простага. Малярухомы лад жыцця, працяглая праца ў становішчы седзячы або стоячы, пад'ём цяжараў — усё гэта рана ці позна можа прывесці да ўтварэння балючых вузельчыкаў.

Спецыялісты ж глядзяць на праблему шырэй. Бяда не столькі ў сядзячым ладзе жыцця, колькі ў тым, што чалавек з'яўляецца... прамахадзячай істотай. У жывёл гемарою не бывае. Вертыкальнае становішча чалавечага цела стварае больш высокі ціск крыві ў венах ног, таза і прамой кішкі.

З узростам тонкія сценкі нашых вен слабеюць, расцягваюцца. Калі дадаць да гэтага бязладны прыём вострай і тлустай ежы, «запраўленай» алкаголем, праблемы вам забяспечаныя. Спачатку са страваваннем, затым з апаражненнем кішэчніка (прадвеснік расшырэння вен прамой кішкі — хранічны запор), а там і да гемарою недалёка. (Аднак ведайце: дыярэя таксама небяспечная — высокая кіслотнасць вадкага стулу раздражняе ўнутраны сфінктар і выклікае яго спазм.)

Часта ўтварэнне балючых гемараідальных вузлоў і гузоў правакуюць цяжарнасць і роды: прамая кішка ў будучых мам як быццам прыціскаецца маткай, сасуды перацiскаюцца. Да таго ж падчас родавых патуг рэзка павялічваецца ціск унутры жывата.

## ЯК ВЫЯЎЛЯЕЦЦА?

Пра хваробу сігналізуе нямоцнае смыленне, сверб, паколванне або распіранне ў вобласці задняга праходу, што ўзнікае падчас акту дэфекацыі, калі калавыя масы праходзяць вобласць запалёных гемараідальных вузлоў. Балючае зацвярдзенне, якое ўтварылася вакол ануса, уяўляе сабой спляценне расшыраных крывяных сасудаў і можа «вырасці» велічынёй з грэцкі арэх!

Калі смыленне і боль становяцца нясцерпнымі, а прыбіральня асацыюецца з камерай катаванняў, пішы прапала. Хвароба ўжо ўступіла ў свае правы. З часам непрыемныя адчуванні ўзмацняюцца, боль становіцца распіраючым, пульсуючым, не дазваляе не толькі апаражніць кішэчнік, але і стаяць, хадзіць, сядзець. Пры кашлі, нават самым малым руху цела пранізваюць тысячы вострых іголак.

Гемарой не толькі баліць, ён яшчэ і «плача» крывавымі слязамі. Крывацёк пачынаецца падчас дэфекацыі, часам пры напружванні, але часцей адразу пасля апаражнення кішэчніка. Кроў выцякае кроплямі, струменьчыкам, мае ярка-чырвоны, пунсовы колер. Калі крывацёкі адбываюцца кожны дзень на працягу некалькіх тыдняў, то развіваецца анемія, узмацняецца слабасць.

## ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНЫ?

Многія не спяшаюцца наведаць урача, памылкова мяркуючы, асабліва на ранніх стадыях развіцця хваробы, што гемарой бяскрыўдны. Але гэта зусім не так! Цячэнне гемарою можа суправаджацца ўзнікненнем на яго фоне іншых захворванняў, такіх, як вострая і хранічная анальная трэшчына, рэктальны свішч, гнайнікі вакол прамой кішкі, аслабленне здольнасці да ўтрымання газаў і інш. У запушчаных выпадках могуць развіцца такія ўскладненні вострага гемарою, як масіўныя крывацёкі, ацёк анальнай адтуліны, гнойны парапрактыт, некроз (амярцвенне) тканак гемараідальнага вузла. У такім выпадку асабліва небяспечныя спробы самастойна ўправіць вузлы назад у прамую кішку — гэта можа пагражаць заражэннем крыві. Выдаленне амярцвелых тканак праводзіцца ва ўмовах стацыянара.

Але больш небяспечна іншае: шэраг захворванняў, у тым ліку паліпы і злаякасныя пухліны прамой кішкі, маюць падобныя з гемароем сімптомы. Таму не закрывайце вочы на сваю далікатную праблему — звярніцеся да доктара!

## ЦІ МОЖНА АД ЯГО ПАЗБАВІЦЦА?

Лячэнне гемарою пры дапамозе мазяў, свечак, таблетак — занятак вельмі важны, але ў большасці выпадкаў не дазваляе канчаткова пазбавіцца ад захворвання, а прыносіць толькі часовую палёгку. Гэта датычыцца і шматлікіх рэцэптаў народнай медыцыны.

Апошнім часам з'явілася дастаткова дзейных метадаў пазбавіцца ад гемарою без скальпеля, без шпіталізацыі і ўскладненняў. Адзін з іх — лігіраванне гемараідальнага вузла. Сутнасць працэдуры заключаецца ў накладанні латэксных кольцаў на вузел спецыяльным апаратам. Вузел адрываецца на 7—9-ы дзень. Часам працэдуру даводзіцца праводзіць у некалькі сеансаў.

Другі метад лячэння — інфрачырвоная каагуляцыя, калі на гемараідальны вузел уздзейнічаюць высокай тэмпературай. Пры гэтым наканечнік каагулятара прыкладваецца да аснавання гемараідальнага вузла ў 3—5 кропках. Адна-дзве секунды — і ад былых пакут не застаецца і следу. Пасля такой працэдуры ўчарашнія хворыя могуць вяртацца да нармальнага ладу жыцця і нават прыступаць да працы ў той жа дзень або на наступныя суткі.

Прымяняюць пры гемароі і лазерную каагуляцыю (адсячэнне гемараідальнага вузла з далейшым яго рубцаваннем).

Вельмі папулярным стаў апошнім часам і метад склератэрапіі, які заключаецца ва ўвядзенні ў гемараідальны вузел склеразавальнага сродку, у выніку чаго адбываецца ўшчыльненне вузла і яго атрафія.

## МАЙ НА ЎВАЗЕ!

***Тым, хто хоча пазбегнуць праблем з гемароем, спецыялісты раяць:***

- піце не менш як 1,5—2 літры вадкасці ў дзень;
- ешце пабольш каш, свежай гародніны і садавіны (асабліва багатых на клятчатку кабачкоў, гарбузоў, буракоў, чарнасліву, бананаў, абрыкосаў). Пажадана ўключаць у рацыён жытняе або пшанічнае вотруб'е, марскую капусту, насенне лёну, якія аблягчаюць транзіт кішэчнага змесціва і ліквідуюць запоры;
- радзей ужывайце спіртныя і газаваныя напоі, вострую, салёную ежу;
- рухальную актыўнасць кішэчніка ўзмацняе піццё мінеральных водаў. Асабліва карысныя высокамінералізаваныя і сярэднемінералізаваныя воды: 1 шклянка вады 2—3 разы на дзень. Пры запоры рэкамендуецца раніцай да яды выпіць шклянку халаднаватай вады для «запуску» кішэчніка;
- слабіцельным і клізмамі не захапляйцеся, каб не траўмаваць адчувальную да вонкавых уздзеянняў анальную зону;
- пазбягайце пад'ёму цяжараў;
- рэгулярна выконвайце фізічныя практыкаванні, асабліва для брушнога прэса і ног. На працягу дня, нават пры сядзячай працы, зрабіце 10—20 практыкаванняў з напружаннем ягадзіц для паляпшэння кровазвароту органаў малога таза;
- тым, хто шмат часу праводзіць за рулём, рэкамендуецца часцей рабіць перапынкі і не грэбаваць фізічнымі практыкаваннямі;
- апаражняйце кішэчнік толькі ў тым выпадку, калі адчуеце позыў;
- калі ў вас лішняя вага, зрабіце захады, каб пазбавіцца ад яе;
- не займайцеся самалячэннем. Пры з'яўленні прыкмет дыскамфорту неадкладна звярніцеся да доктара.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Дзіцячая тэма

# «НОЖКІ БАЛЯЦЬ!..»

**БЫВАЕ так, што дзіця днём абсалютна здаровае, а ўвечары ў яго пачынаюць балець ножкі. Альбо яно прачынаецца ад болю ўначы. Што ж гэта за захворванне і наколькі яно небяспечнае?**

**У ЧЫМ ПРЫЧЫНЫ?**

Гэтыя болі называюцца болямі росту. Яны непакояць не ўсіх дзяцей; а ў некаторых болі настолькі слабыя, што дзеці проста не звяртаюць на іх увагі. Да канца іх прычыны і механізм узнікнення не раскрытыя. *Адной з прычын урачы лічаць тое, што косці растуць хутка, а мышачная сістэма за імі не паспявае, у выніку мышцы і сухажыллі нацягваюцца, шчыльна прылягаюць да касцей і сціскаюць суставы, што выклікае адчуванне дыскамфорту*. Інтэнсіўнасць і лакалізацыя болю могуць быць рознымі: часцей гэта пярэдняя паверхня сцягна, галёнкі або лыткі. Сёння можа балець адно калена, заўтра абедзве шчыкалаткі. Падобныя болі могуць у асобных выпадках непакоіць нават 3-гадовае дзіця, але найбольш яны распаўсюджаныя сярод 4—9-гадовых.

Болі росту ў нагах можна параўнаць з адчуваннямі пасля цяжкай фізічнай нагрузкі ў спартзале. Чаму ж баляць менавіта ножкі і менавіта па начах? На працягу дня дзіця шмат ходзіць, бегае, скача, удзельнічае ў рухомых гульнях, і такім чынам найбольшая нагрузка прыпадае менавіта на ногі.

У многіх выпадках хваробы росту могуць быць выкліканыя перанапружаннем тугіх мышцаў. Апошнія не прычыняюць болі, калі дзеці бегаюць або займаюцца практыкаваннямі, але пачынаюць балець, калі расслабляюцца ўначы.

Трэба адрозніваць болі росту ад сутаргаў мышцаў. Сутаргі ўяўляюць сабой востры боль, звычайна ў ікраножнай мышцы, які суправаджаецца спазмамі. Пры сутаргах, як правіла, можна бачыць мышачныя спазмы. А пры болях росту іх няма.

Як няма і пэўнай перыядычнасці гэтых боляў. Яны з'яўляюцца без бачнай прычыны, то часцей, то радзей. Сёння малое вохкае і ахкае ад ныючага болю, а заўтра бегае як ні ў чым не бывала. Лыткі могуць паныць некалькі вечароў, а потым перастануць, і болі паўторацца толькі праз месяц або год. А могуць знікнуць зусім.

**КАЛІ ЗВЯРНУЦЦА ДА ЎРАЧА**

Боль у нагах у дзяцей нярэдка можа быць сімптомам сур'ёзнага захворвання — рэўматоіднага артрыту. Неабходна звярнуцца да доктара, калі боль суправаджаецца наступнымі сімптомамі:

высокая тэмпература;

апухлі суставы або мышцы;

стомленасць, страта апетыту і вагі;

малы пачаў кульгаць;

ранішнія болі пасля абуджэння.

*Пасля таго як доктар выключыў усё сур'ёзнае, напрыклад артрыт, вы можаце паспрабаваць прымяняць розныя сродкі, каб высветліць, якія з іх падыдуць вашаму дзіцяці і дапамогуць яму пры болях.*

- Падбадзёрце малое заспакаяльнымі словамі. Боль палохае дзяцей, нават калі яго прычынай з'яўляецца простае мышачнае напружанне. Патлумачце маломy, што болі ў нагах выкліканы, хутчэй за ўсё, перанапружаннем, і што гэта хутка пройдзе.
- Паспрабуйце расціранне рукамі. Болі, звязаныя з ростам, часта знікаюць пасля масажу. Асцярожна масажуйце ногі дзіцяці ў тых месцах, дзе сканцэнтраваўся боль, да таго часу, пакуль малое не адчуе сябе лепш.
- Абагрэйце балючыя месцы. Цяпло можа аказаць заспакаяльны ўплыў, асабліва калі крыніцай болю ў дзіцяці з'яўляецца мышачны боль. Цёплая ванна або сагравальны кампрэс дапамогуць зняць боль, але не пакідайце дзіця без нагляду з саграваальным кампрэсам на доўгі час.
- Змагайцеся з болем. Лёгкае болесуцішальнае лякарства можа дапамагчы дзіцяці.

Медыкі адзначаюць, што паза хатняй абстаноўкай прыступы слабеюць або спыняюцца. Але ў любым выпадку пры частых болях у нагах лепш за ўсё звярнуцца да доктара, каб пераканацца ў тым, што ўсё ў парадку і дзіця сапраўды проста хутка расце.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## АКТЫЎНЫ СТАРТ МАСАВАЙ ПАСЯЎНОЙ

Чвэрць ад задання паспелі пасеяць у Калінкавіцкім раёне. З пацяпленнем у выхадныя рэзка актывізавалася пасяўная кампанія на Гомельшчыне. Правесці яе давядзецца за 10-12 дзён. Механізатары працуюць у дзве змены, гарачае харчаванне для іх прывозяць на поле. Земляробы Гомельшчыны ўзялі добры старт. Па стане на раніцу 4 красавіка яравыя пасеяны на 23 тысячах гектараў (12% да задання). У цэлым па вобласці пасяўныя плошчы ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур павялічаны на 48 тысяч гектараў (34,6%) і складаюць 187 тысяч гектараў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЗА ВОСЕМ ДЗЯСЯТКАЎ? ГІРАВІК!

**У Віцебску ўпершыню прайшоў чэмпіянат свету і Еўропы па гіравым спорце сярод майстроў. У спаборніцтвах удзельнічалі звыш 370 спартсменаў з больш як 20 краін. Геаграфія краін, прадстаўнікі якой пажадалі паказаць клас, багатая: ЗША, Японія, Грэцыя, Украіна і іншыя. Цікава, што старэйшаму спартсмену ўжо за восемдзесят гадоў. А спартсменцы... 76. Дарэчы, гіравікоўдам сярод удзельнікаў было больш за пяцьдзясят.**

Гледачы ўбачылі самыя розныя спаборніцтвы: гіравыя марафон, эстафету і нават жангляванне. І на свае вочы можна было ўбачыць, як за секунду чалавек узнімае гіру... тры разы. У рамках чэмпіянату прайшоў і першы адкрыты чэмпіянат Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Ініцыятарам правядзення спаборніцтваў стаў выхадзец з Беларусі Анатоль Мікалаевіч Яжоў, які цяпер жыве ў Расіі. Ён ставіў сусветныя рэкорды па падняцці гіры ў экстрэмальных умовах на ўсіх кантынентах: у Антарктыдзе, на вулканах, у Альпах... Усяго ў 45 экстрэмальных кропках планеты. Падымаў гіры пад вадой, пад зямлёй. Збіраецца хутка падняць у бязважкасці. А ў беларускім Віцебску ён жыў, вучыўся, тут пахаваныя яго бацькі. Анатоль Яжоў — прэзідэнт міжнароднай канфедэрацыі майстроў гіравога спорту, да ўсяго ён прафесар, доктар эканамічных навук, а таксама ганаровы член самых розных акадэмій, рэктар, член расійскага саюза рэктараў, пісьменнік, паэт... У свае 65 гадоў Яжоў выглядае вельмі добра. І раіць усім займацца самым народным спортам, каб да глыбокай старасці адчуваць сябе бадзёрым. Славуты гіравік ведае тыбецкія сакрэты захавання маладосці, вядзе здаровы лад жыцця. Яжоў упэўнены ў добрых перспектывах гіравога спорту ў нашай краіне і зробіць усё магчымае, каб прозвішчы беларускіх волатаў прагучалі на ўвесь свет.

«Спорт гэты не патрабуе вялікіх выдаткаў і з'яўляецца насамрэч народным», — расказвае наш знакаміты зямляк. — «...І ёсць ужо некалькі выпадкаў, калі нават ад інваліднасці людзі пазбавіліся дзякуючы заняткамі гірамі».

Дарэчы, гіры, з якімі выступалі на спаборніцтвах, пасля заканчэння падарылі віцебскім школьнікам і нават выхаванцам калоніі для падлеткаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НАРКОТЫКІ ВЫРАБЛЯЛІ ДОМА

У Наваполацку міліцыянеры дома ў мясцовага жыхара знайшлі лабараторыю па вырабе наркотыка (амфетаміну). Канфіскавалі спецыяльнае абсталяванне прамысловай вытворчасці, хімічныя рэагенты і гэтак далей. Затрымалі 25-гадовага гаспадара і 28-гадовага жыхара суседняга Полацка, якія арганізавалі незаконную вытворчасць. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ТЕХНОБАНК

Наименование банка **ОАО «ТЕХНОБАНК»**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 17948,0 | 6529,5 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 28,7 | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.2 | 48404,8 | 35790,1 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.3 | 30401,7 | 3394,1 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.4 | 18610,7 | 23,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.5 | 228627,0 | 100247,7 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.6 | 66,5 | 50,8 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.7 | 79486,2 | 53008,4 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 3.8 | 28011,2 | 9259,1 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 3.9 | 49840,9 | 55976,6 |
| 13 | **ИТОГО АКТИВЫ** | **11** | | **501425,7** | **264279,5** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 3.10 | 15766,3 | 28383,6 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 3.11 | 29794,0 | 20384,2 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 3.12 | 262609,6 | 101866,9 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 3.13 | 72632,1 | 16,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 3.14 | 93,5 | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 3.15 | 11806,0 | 64033,4 |
| 21 | **ВСЕГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **120** | | **392701,5** | **214684,3** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 3.16 | 46450,4 | 22575,6 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 7060,6 | 6459,0 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.17 | 43714,2 | 16179,2 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.18 | 11499,0 | 4381,4 |
| 28 | **ВСЕГО КАПИТАЛ** | **121** | | **108724,2** | **49595,2** |
| 29 | **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | **12** | | **501425,7** | **264279,5** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 33374,3 | 16122,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 19961,1 | 15458,5 |
| 3 | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **13413,2** | **663,7** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 19405,5 | 10447,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3368,2 | 2017,7 |
| 6 | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **16037,3** | **8430,1** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 3,8 | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | 47,8 | (32,9) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 12704,0 | 7154,4 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | (947,1) | 198,2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 2606,2 | 4468,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 27847,4 | 38852,2 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 59299,6 | 47045,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 3567,5 | 1418,4 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 3633,1 | 2333,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 1424,7 | 602,2 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **2208,4** | **1731,6** |
| | **Базовая прибыль на простую акцию** | | | **110,1 руб.** | **145,4 руб.** |
| | **Разводненная прибыль на простую акцию** | | | **-** | **-** |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 01 января 2009 года | 3011 | 19985,3 | - | 7249,2 | 4524,6 | 7551,5 | 39310,6 |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | 2590,3 | - | (790,3) | (143,0) | 8627,6 | 10284,6 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 2.1 | Совокупный доход | 30121 | X | X | X | 1731,6 | 8627,6 | 10359,2 |
| 2.2 | Направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 1800,0 | (1800,0) | X | - |
| 2.3 | Операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | X | (12,8) | X | (12,8) |
| 2.4 | Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - |
| 2.5 | Выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (12,8) | X | (12,8) |
| 2.6 | Операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | X | X | X | X | - |
| 2.7 | Перераспределение между статьями капитала | 30125 | 2590,3 | - | (2590,3) | - | - | - |
| 2.8 | Прочие изменения | 30126 | - | - | - | (61,8) | - | (61,8) |
| 3 | Остаток на 01 января 2010 года | 3013 | 22575,6 | - | 6458,9 | 4381,6 | 16179,1 | 49595,2 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 01 января 2010 года | 3011 | 22575,6 | - | 6458,9 | 4381,6 | 16179,1 | 49595,2 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 23874,8 | - | 601,7 | 7117,4 | 27535,1 | 59129,0 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 5.1 | Совокупный доход | 30121 | X | X | X | 2208,4 | 9119,9 | 11328,3 |
| 5.2 | Направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 600,0 | (600,0) | X | - |
| 5.3 | Операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | X | (1246,6) | X | (1246,6) |
| 5.4 | Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - |
| 5.5 | Выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (1246,6) | X | (1246,6) |
| 5.6 | Операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | X | X | X | X | - |
| 5.7 | Перераспределение между статьями капитала | 30125 | 1551,3 | - | (1121,6) | (91,6) | (338,1) | - |
| 5.8 | Прочие изменения | 30126 | 22323,5 | - | 1123,3 | 6847,2 | 18753,3 | 49047,3 |
| 6 | Остаток на 01 января 2011 года | 3013 | 46450,4 | - | 7060,6 | 11499,0 | 43714,2 | 108724,2 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **Прибыль(убыток) за отчетный период** | **301211** | | **2208,4** | **1731,6** |
| 2 | **Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период** | **301212** | | **9119,9** | **8627,6** |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | Переоценка основных средств | 3012121 | | 9087,2 | 8623,4 |
| 2.2 | Переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 32,7 | - |
| 2.3 | Переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | 4,2 |
| 2.4 | Переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | Переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | **ИТОГО совокупный доход за отчетный период** | **30121** | | **11328,3** | **10359,2** |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 16358,5 | 8216,1 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (-16244,3) | (-16270,7) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 16220,5 | 10447,9 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (-2865,0) | (-1986,3) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 3,8 | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 6,7 | (-31,7) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 9331,2 | 5721,4 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | (-860,4) | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 398,3 | 2757,0 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (-33531,5) | (-22297,4) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (-1200,5) | (-416,0) |
| 13 | **Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого** | **701** | | **(-12382,7)** | **(-13859,7)** |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 1942,5 | 1976,2 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (-325,7) | 7070,5 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 282,5 | 4589,3 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (-23575,4) | 14940,4 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 29766,3 | (-7802,0) |
| 20 | **Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого** | **702** | | **8090,2** | **20774,4** |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (-637,6) | (-10787,0) |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (-6326,9) | (-26194,6) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 72673,1 | 6522,9 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 49722,3 | (-12535,7) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | 93,5 | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обяз-вах | 70305 | | (-38535,8) | 12084,8 |
| 27 | **Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого** | **703** | | **76988,6** | **(-30909,6)** |
| 28 | **Чистый поток денежных средств полученных (использованных) от операционной деятельности** | **70** | | **72696,1** | **(-23994,9)** |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (-50104,8) | (-11180,6) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 18544,3 | 36114,0 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | 23,0 | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| | Приобретение бизнеса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» | 71106 | | 15291,2 | - |
| 36 | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности** | **71** | | **(-16246,3)** | **24933,4** |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (-17,5) | (-19,1) |
| 42 | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности** | **72** | | **(-17,5)** | **(-19,1)** |
| 43 | **Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты** | **73** | | **262,8** | **855,4** |
| 44 | **Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов** | **74** | | **56695,1** | **1774,8** |
| 45 | **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода** | **740** | | | **12499,0** |
| 46 | **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода** | **741** | | **69194,1** | |

**Председатель Правления** **Д.Л. Михалевич**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

**«23» марта 2011 года**

Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, сведений о совокупном доходе, отчета о движении денежных средств подтверждена.

**Директор частного предприятия «БДО»** **А.Н. Шкодин**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г. УНП 100706562.*

BDO

Телефон: +375 17 210 04 73
Факс: + 375 17 210 04 75
www.bdo-belarus.by

Частное предприятие «БДО»
ул. Скрыганова, 6а
помещение 14
офисное помещение 40
220073 Минск Беларусь

Акционерам и Наблюдательному Совету ОАО «Технобанк»
Председателю Правления ОАО «Технобанк»
г-ну Михалевичу Дмитрию Леонидовичу
ул. Кропоткина, 44
г. Минск
Республика Беларусь
220002
ОАО «Технобанк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь 05.08.1994
регистрационный номер 47

Исх. номер 04-03/18/618

**Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Технобанк» за 2010 год**

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности Открытого акционерного общества «Технобанк» (далее – Банк), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2011 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2010 год, а также пояснительной записки.

*Ответственность руководства относительно бухгалтерской (финансовой) отчетности*

Ответственность за подготовку и объективное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь несет руководство Банка. Ответственность руководства Банка заключается в разработке, внедрении и поддержании системы внутреннего контроля, относящейся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой; а также в выборе и применении соответствующей учетной политики и определении оценочных значений, адекватных текущим обстоятельствам.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о бухгалтерской (финансовой) отчетности на основе проведенного нами аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля Банка.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в бухгалтерской (финансовой) отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Технобанк» на 1 января 2011 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2010 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами было установлено, что Банком допускались факты несоблюдения в 2010 году нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, изложенные в разделе 12 «Выполнение ОАО «Технобанк» нормативов безопасного функционирования в 2010 году» пояснительной записки. Другие факты несоблюдения Банком нормативов безопасного функционирования в 2010 году, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, нами не обнаружены.

Мы также не обнаружили факты, свидетельствующие о существенном несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объему осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

*Поясняющий параграф*

Не делая оговорок к нашему мнению, мы обращаем внимание на ряд фактов, которые раскрываются в вышеуказанном разделе пояснительной записки к бухгалтерской (финансовой) отчетности о деятельности Банка относительно неоднократного невыполнения Банком нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком для банков, а также относительно высокого кредитного, процентного и валютного рисков (раздел 11 «Управление рисками»). Данные факты свидетельствуют о неопределенности, которая может вызвать сомнения в способности Банка продолжить непрерывную деятельность в обозримом будущем, зависящей от финансовой поддержки его акционеров, а также способности Банка реализовать отступные в виде объектов недвижимости и имущественных прав на объекты недвижимости, которые поступят в будущем, получаемые в качестве погашения выданных кредитов. Данная бухгалтерская (финансовая) отчетность подготовлена исходя из предположения, что Банк будет продолжать свою деятельность в обозримом будущем, и не включает корректировок, которые могут возникнуть вследствие вышеуказанной неопределенности.

**Заключение по иным требованиям законодательства**

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2011 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2011 года составлены ОАО «Технобанк» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).



**Шкодин Александр Николаевич**
Директор
Управляющий партнер
БДО в Беларуси

**Демидович Наталья Сигизмундовна**
Руководитель аудиторской группы

28 марта 2011 года

г. Минск, Республика Беларусь

Частное предприятие «БДО»
Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом 17.11.2010, УНП 190241132

БДО, белорусское частное предприятие, член международного объединения независимых компаний BDO. Название BDO относится к фирмам, являющимся участниками BDO International Limited, британского общества с ответственностью, ограниченной гарантией его участников. BDO – торговая марка объединения BDO и каждой компании-участницы объединения.

## У ШКЛОВЕ ЯДНАЮЦЦА З РАСІЯНАМІ ПРАЗ НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

**Школьнікі горада Шклова з нагоды Дня яднання Беларусі і Расіі зрабілі тэлемост са сваімі аднагодкамі ў раённым цэнтры Аленіна Цвярской вобласці.**

Сучасныя школьнікі актыўна карыстаюцца інфармацыйнымі тэхналогіямі і рознымі спосабамі кантактавання праз інтэрнэт. Але тут адбылася міждзяржаўная калектыўная канферэнцыя!

— У тэлемосце бяруць удзел тыя, каму будаваць будучыню нашых дзяржаў — школьнікі гарадоў-пабрацімаў! — аб'явіла вядучая тэлемоста.

Пасёлак Аленіна — пабрацім беларускага Шклова, раённыя цэнтры маюць дамову аб супрацоўніцтве ў розных сферах. Маладыя людзі найбольш цікавіліся падрабязнасцямі жыцця равеснікаў: пра школьную форму, моладзевыя арганізацыі, укараненне электронных дзённікаў і журналаў, навучальную спецыялізацыю, даследчую працу. І, вядома, школьнікі Шклова і Аленіна спадзяюцца ў будучыні сустрэцца рэальна, а не віртуальна.

У Магілёве 1 красавіка адбыўся святочны канцэрт з удзелам кіраўніцтва Магілёўскай вобласці і дэлегацый гарадоў-пабрацімаў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ВЯСЛЯРНЫ КАНАЛ — НЕ МЕСЦА ДЛЯ РЫБАЛКІ

У вяслярным канале ў Брэсце знайшлі цела 50-гадовага мужчыны. Высветлена, што ён патануў падчас рыбалкі.

**Яна СВЕТАВА.**

## АГОНЬ ПРЫБРАЎ МАЁМАСЦЬ

**4 красавіка раніцай 87-гадовая жыхарка вёскі Дубаўка Бабруйскага раёна вырашыла прыбраць падворак пасля зімы з дапамогай... падпалу смецця і пустазелля. Праўда, у абед унук пенсіянеркі затушыў агонь і забараніў бабулі паліць. Але, як толькі ён пайшоў на працу, гаспадыня зноўку ўзялася за справу, вынікам якой стала знішчэнне хлява і веранды, пашкоджанне даху і перакрыцця дома, а таксама і маёмасці.**

Магілёўскае абласное УМНС просіць: перш чым падпаліць мінулагоднюю траву — падумайце пра тое, што такім чынам вельмі хутка рызыкуеце страціць нажытую маёмасць, а таксама заплаціць істотны штраф — ад 10 да 40 базавых велічынь.

**Ілона ІВАНОВА.**

## СКРАЛА Ў ДЗІЦЯЦІ САМАЕ ДАРАГОЕ — ТЭЛЕФОН

**Жыхарка Бабруйска, якой 44 гады, скрала мабільнік у 9-гадовага школьніка, паведамляе прэс-служба Магілёўскага УУС.**

Вучань 4 класа надвячоркам гуляў разам з сябрам на вуліцы. Хлопчыкі набегаліся і прыселі на траву, тэлефон адзін з іх паклаў побач. Жанчына, якая ішла міма, проста падабрала апарат і пайшла прэч. Хлопчыкі беглі за ёй і прасілі вярнуць мабільнік, аднак на ўгаворы жанчына не паддалася. Тады дзеці выклікалі міліцыю, і ўжо з дапамогай міліцыянераў дзіця вярнула сабе тэлефон. А жанчыну цяпер абвінавачваюць у рабаўніцтве, ёй пагражае зняволенне да 4-х гадоў.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ЗАМЕСТ ЦІРА — ПАЛІКЛІНІКА

**Заведзена крымінальная справа ў дачыненні 19-гадовага жыхара абласнога цэнтра, які страляў з пнеўматычнага пісталета... па вокнах у грамадскіх месцах, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Малады чалавек, які раней не прыцягваў увагу праваахоўных органаў, пашкодзіў пяць шыб у адной з гарадскіх паліклінік, а таксама тры шыбы і два ілюмінатары ў цеплаходзе, што стаяў на прыстані. Зламысніку пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да шасці гадоў. А калі б куля трапіла ў чалавека, то пакаранне была б яшчэ большым. І не толькі гэтаму стралку, бо следства адпрацоўвае версію, што ў яго было саўдзельнікі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПАКРЫЎДЗІЎСЯ

**30-гадовы мужчына з в. Лясная (Баранавіцкі раён) зайшоў да суседкі, але тая з ім гаварыць не стала і прагнала з падворка.**

Сусед моцна пакрыўдзіўся на жанчыну, узяў электраліт, зліты з акумулятараў, і выкарыстаўшы момант, абліў ім дзве аўтамашыны, якія стаялі ў суседнім двары. Фарба з «Опеля» і «Мерседэса» спаўзла. Ніхто злачынства гэтага не бачыў, а выйсці на злоснага хулігана ўдалося пазней. Заведзена крымінальная справа.

## ПАШКАДАВАЛА

**Невядомы выбіў шыбу ў кватэры пенсіянеркі, якая жыве па вул. Агароднай у Пінску, і ўкраў 1 700 000 рублёў і 1 223 долары.**

Хоць аператыўнікі і высветлілі, што жанчыну абакраў 17-гадовы жыхар Пінска, але яна чамусьці адмовілася пісаць заяву ў міліцыю.

## ШАНЦУЕ ДА ПАРЫ — ДА ЧАСУ

**Двое жыхароў в. Зарытава, рабочыя СВК, і беспрацоўны з в. Жарабковічы (Ляхавіцкі раён) праз праём у сцяне склада выкралі 663 кг сухіх жамерынаў. Зладзеяў затрымалі.**

А вось рабаўнікам, якія выцягнулі ў пенсіянеркі в. Шавелі гэтага ж раёна 200 кг збожжа і 240 кг бульбы, пакуль што шанцуе — іх шукаюць.

## АДНАКЛАСНІКІ СЕЛІ ВЫПІЦЬ

**Калі ў бальніцу даставілі 15-гадовага жыхара в. Глінка (Столінскі раён) з нажавым раненнем жывата, то міліцыя пачала разбірацца ў сітуацыі.**

Як высветлілася, пацярпелы з аднакласнікам з гэтай жа вёскі зайшлі да пенсіянера выпіць. Пасля выпіўкі паміж вучнямі ўзнікла сварка, а пад руку трапіў нож...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ЧОРНЫЯ ПРЫБЫТКІ НА 40 МІЛЬЁНАЎ

У поўным аб'ёме пакрыў нанесеную дзяржаве шкоду і пералічыў грашовыя сродкі ў мясцовы бюджэт жыхар Добруша, які займаўся скупкай у Беларусі і продажам у Расіі чорных і каляровых металаў. Між іншым, вярнуць яму прыйшлося 40 мільёнаў рублёў. Факты незаконнага абароту лому і адходаў металаў былі выяўлены супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гомельскага аблвыканкама падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў. Як высветлілася, 30-гадовы грамадзянін на працягу пяці гадоў, не маючы ліцэнзіі, ажыццяўляў незаконную дзейнасць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АДЗЕННЯ, ШКАРПЭТАК: БЯРЫ — НЕ ХАЧУ

Супрацоўнікі міліцыі разам з памежнікамі ў ходзе адпрацоўкі памежных з Украінай тэрыторый знайшлі ў хлявах вёсак Макраны і Старое Забалацце Маларыцкага раёна 19 буйнагабарытных пакетаў і тры каробкі шкарпэтак і адзення на суму больш за 35 мільёнаў рублёў. Гаспадар маёмасці не аб'явіўся. У вёсцы Вужова Кобрынскага раёна таксама знайшоўся хлеў з 19 буйнагабарытнымі пакетамі, напакаванымі імпартнай вопраткай на суму каля 33 мільёнаў рублёў. Жыхар суседняй вёскі, уласнік хлява ў Вужове, сказаў, што першы раз бачыць тавар. Значыць, разбірацца са знаходкай будуць кампетэнтныя службы.

**Яна СВЕТАВА.**

## З ЧУЖОЙ БАНКАЎСКАЙ КАРТКІ

**Хітры будаўнік з Віцебска, знаходзячыся ў камандзіроўцы ў Верхнядзвінску, увайшоў у давер да мясцовай жыхаркі і здымаў грошы з яе банкаўскай карткі.**

Сяргей Смірноў (імя і прозвішча зменены) прыехаў на будаўніцтва разам са сваёй брыгадай. У атэлі святкавалі прыезд. Сяргей вырашыў прайсціся па горадзе. І пазнаёміўся з мужчынам. Той прапанаваў адсвяткаваць знаёмства. Купілі віно ў краме. Але ж не піць на вуліцы, вырашылі яны і пайшлі ў госці да мясцовай жыхаркі, якую ведаў новы знаёмы прыезджага. Ала прыняла гасцінна. Потым кампанію дапоўніла яе сяброўка Святлана. Калі спіртное скончылася, захацелі дабавіць. Жанчыны вырашылі адправіць па новую партыю выпіўкі мужчын. Ды апошнія прызналіся, што грошай больш, на жаль, няма. Святлана вырашыла пачаставаць усіх удзельнікаў застолля. Даверыла Сяргею банкаўскую картачку, і код сказала. Потым адпачывалі да раніцы. А дзе ж Сяргей з яе карткай быў той самай раніцай? Знік. Высветлілася, што прычына для гэтага была. Акрамя таго, што ён аплаціў пакупкі ў краме, астатак грошай зняў і пакінуў сабе.

Як паведаміў «Звяздзе» Віталь Тамашэвіч, следчы следчага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па Верхнядзвінскім раёне, злодзея затрымалі па гарачых слядах.

Яшчэ адзін выпадак карыстання чужой банкаўскай карткай адбыўся таксама ў Верхнядзвінску. Вясковая жыхарка забыла картку ў банкамаце. Яе знайшоў грамадзянін, які прыйшоў правяраць баланс свайго рахунку. Радасці было шмат. Не адзін дзень рабіў пакупкі ў крамах, дзе не патрабуецца пацвярджаць плацеж увядзеннем пін-кода. І яго хутка «вылічылі» праваахоўныя органы. Не забылі прыцягнуць да строгай дысцыплінарнай адказнасці і гандлярак магазінаў, якія не правяралі супадзенне подпісу на зваротным баку карткі і выдадзеных чэках.

У абодвух выпадках хітрыя мужчыны, якія не пасаромеліся карыстацца чужымі грашыма, асуджаны да розных тэрмінаў абмежавання волі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# У БРЭСЦЕ АКТЫЎНА «ВЫМЫВАЕЦЦА» ТАННАЕ ЖЫЛЛЁ

**УВОГУЛЕ нейкія знакавыя тэндэнцыі развіцця другаснага рынку жыллёвай нерухомасці «даходзяць» да рэгіёнаў праз пэўны час. Калі танныя хадавыя кватэры ў сталіцы скупляліся кліентамі яшчэ летась у снежні, то ў абласных цэнтрах падобная актывізацыя пакупнікоў назіраецца толькі вясной.**

### Якасныя і ліквідныя кватэры на рынку не затрымліваюцца

Паводле інфармацыі **дырэктара «Дзяржаўнага агенцтва нерухомасці г. Брэста» Анатоля ВАЙТОВІЧА**, цяпер на другасным рынку кватэр у горадзе над Бугам дастаткова і прадаўцоў, і пакупнікоў жылля. Попыт, які існуе, амаль цалкам задавальняецца, былі б толькі жывыя грошы. Сёння нават пакуль хапае і зусім таннага жылля. Праўда, за мінімальны кошт прапануюцца сапраўды маленькія кватэры. Напрыклад, аднапакаёвыя кватэры-маласямейкі з кухняй плошчай каля 4-5 кв. метраў і жылым пакойчыкам у межах 10-12 «квадратаў» прапануюцца на продаж за 24-25 тысяч долараў. Існуюць кватэры ў старых дамах агульнай плошчай да 34 кв. метраў, без балконаў, якія каштуюць да 28 тысяч долараў. Сярэдні кошт аднапакаёвак стандартнага класа вагаецца ў межах 30-32 тысяч долараў. Больш якасныя аднапакаёўкі новай планіроўкі з агульнай плошчай 47 квадратных метраў выстаўляюцца на продаж ужо за 43-45 тысяч долараў.

Ёсць на рынку і зусім маленькія двухпакаёвыя кватэры агульнай плошчай 36 «квадратаў». Такія кватэры на першым ці на апошнім паверхах прапануюцца за 31 тысячу. Падобнае па якасці, але больш прасторнае жыллё ў старых дамах каштуе ўжо да 35 тысяч долараў. Стандартныя двухпакаёвыя кватэры ў панэльных дамах «цягнуць» ужо да 40 тысяч долараў, а жыллё новай планіроўкі можа каштаваць і да 50 тысяч «зялёных». Існуюць у Брэсце і сапраўды вялікія двухпакаёўкі ў новых дамах. Такое жыллё агульнай плошчай да 70 квадратных метраў гаспадары спрабуюць прадаць за 54-55 тысяч долараў.

Трох- і чатырохпакаёвыя «хрушчоўкі» ў старых дамах трымаюцца амаль у аднолькавым цэнавым дыяпазоне. Напрыклад, сёння ў агенцтва ёсць чатырохпакаёвая кватэра плошчай 58 квадратных метраў, якую спрабуюць прадаць за 37 тысяч долараў. Сярэдні кошт «слабенькіх» шматпакаёвых кватэр вагаецца ў межах 42-45 тысяч долараў. Больш новыя і крыху лепшыя трохпакаёвыя кватэры маюць сярэдні цэннік у межах 50-55 тысяч долараў. Сапраўды якаснае і прасторнае жыллё можа каштаваць і да 80-100 тысяч долараў, аднак попыт сёння на яго нулявы.

Наш эксперт адзначыў, што адносна якаснае і не вельмі дарагое жыллё набываецца пакупнікамі на працягу аднаго-двух тыдняў.

### Пакупнікі сутыкнуліся з праблемай канвертацыі валюты

Эксперты прыватных агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што да апошняга часу пакупнікі актыўна выкарыстоўвалі не вельмі дарагія банкаўскія крэдыты. З прадаўцамі часам расплачваліся і ў беларускіх рублях. Сёння гаспадары жылля патрабуюць разлічвацца з імі выключна замежнай валютай. А вось па гэтым аспекце ў краіне ўзнікла праблема. Частковае выйсце з падобнай сітуацыі пакуль яшчэ ёсць. Напрыклад, калі кліенты прадаюць свае старыя кватэры, каб разлічыцца з будаўнічымі арганізацыямі, дзе яны будуюць новае больш прасторнае жыллё. У гэтым выпадку кватэры прадаюцца часткова за валюту і рублі, а апошнія адразу выкарыстоўваюцца. Калі прадаўцу трэба атрымаць за сваю нерухомасць выключна валюту, тады ажыццявіць падобныя здзелкі стала больш складана.

Больш за тое, апошнім часам банкі пачалі прытарможваць выдачу і буйных рублёвых крэдытаў на набыццё нерухомасці.

У такой неадназначнай сітуацыі вакол валюты асобныя кемлівыя «прадпрымальнікі ад нерухомасці» спрабуюць выкарыстаць гэтую праблему на сваю карысць. Так, тыя пакупнікі, што маюць магчымасць разлічыцца за кватэру за наяўную валюту ў поўным памеры, патрабуюць ад прадаўцоў істотных зніжак. У гэтых выпадках канчатковыя зніжкі могуць дасягаць нават 2-3 тысяч долараў.

### Рынак другаснага жылля можа часова «замарозіцца»

Пакуль у Брэсце кватэры купляюцца і прадаюцца амаль у штатным рэжыме. Ёсць цяжкасці ва ўзаемаразліках паміж кліентамі. Сёння яны неяк яшчэ вырашаюцца, аднак...

Наш эксперт упэўнены, што калі нейкая крытычная сітуацыя вакол валюты пачынае разгортвацца ў сталіцы, то з цягам часу з падобным клубкам праблем сутыкнуцца і ў рэгіёнах. Калі грамадзяне ўвогуле не змогуць набываць валюту, а прадаўцы катэгарычна адмовяцца прадаваць нерухомасць за рублі, тады рынак пачне згортвацца і часова дзейнічаць не будзе.

Відавочна, што насельніцтва сёння моцна цікавіць адно канкрэтнае пытанне, якое датычыцца магчымых цэнавых ваганняў на жыллёвую нерухомасць. Тут спецыялісты адмаўляюцца нешта прагназаваць. На іх погляд, усё залежыць ад агульнай эканамічнай сітуацыі ў краіне. Калі з валютай будуць перабоі і ўзнікне нейкі шэры курс, тады кошт кватэр у беларускіх рублях аўтаматычна павялічыцца. Аднак калі па завышаным кошце ў рублях кватэры набывацца не будуць, то жыллёвая нерухомасць у валюце можа нават патаннець. Час пакажа...

**Сяргей КУРКАЧ.**


Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ИНФОРМИРУЕТ:**

Дата и время проведения аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль» и расположенного на ул. Кижеватова, д. 8 в г. Минске (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.03.2011), переносятся **с 12.00 06.04.2011 на 12.00 08.04.2011**.

**Дополнительные сведения о земельном участке:** границы земельного участка с кадастровым номером 500000000004004175, площадью 0,2360 га, предназначенного для эксплуатации обслуживания продаваемого здания, будут изменены в связи со строительством отдельного проезда, проходящего через указанный земельный участок.

Срок приема документов на участие в аукционе продлевается до **07.04.2011 включительно с 09.00 до 16.00.**

**Реквизиты для перечисления задатка:** расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 212 50 62.**



**г. ВИТЕБСК** **10.05.2011**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ СНИЖЕНА НА 20%**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи объекта аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Изолированное помещение с инв. № 251/D-32147, расположенное по адресу: Витебская область, Верхнедвинский р-н, д. Борковичи | Характеристика объекта недвижимости: пожарное депо общей площадью 75,6 кв.м, 1972 г. постройки, первый этаж одноэтажного кирпичного здания, стены кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, полы цементные и дощатые, крыша рулонная | **7 118 620** | **711 860** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: Учреждение «Витебское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», контактные телефоны: (0212) 476409, 474095.

**Аукцион состоится 10 мая 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка; кроме того, представляют: индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

юридическое лицо – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

иностранное юридическое лицо, иностранная организация, не являющаяся юридическим лицом, созданная в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представитель иностранного инвестора – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представитель гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 06.05.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 10.05.2011 с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

